# С БЛАГОДАРНОСТЬЮ И ЛЮБОВЬЮ

***Выпускники ВГУ имени П.М. Машерова вспомнили свои студенческие годы в нашем университете и поздравили родную альма-матер с юбилеем.***



**Уладзімір Іванавіч ПРАКАПЦОЎ, выпускнік мастацка-графічнага факультэта 1975 года, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, член Беларускага саюза мастакоў, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, Ганаровы акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў, Ганаровы прафесар ВДУ імя П.М. Машэрава:**

«Для кожнага выпускніка роднай alma mater у сэрцы на ўсё жыццё захаваліся гады яго студэнцкай маладосці. Нашы педагогі вучылі не толькі асновам навукі і мастацтва, але і давалі першыя жыццёвыя ўрокі. І калі мы «выляцелі з роднага гнязда», яны заўсёды цікавіліся нашымі справамі, перажывалі за нас, як за сваіх дзяцей.

Мастацка-графічны факультэт са сваёй багатай гісторыяй займае асобнае месца не толькі ў летапісе ўніверсітэта, але і ў гісторыі нацыянальнага мастацтва – многія яго выпускнікі сталі знакамітымі вучонымі, педагогамі і мастацтвазнаўцамі, вядомымі мастакамі, прадаўжальнікамі славутых традыцый «віцебскай школы».

Мне, як і многім выпускнікам, пашчасціла вучыцца ў Алены Ціханаўны Жукавай – куратара нашай групы, цудоўнага педагога і абаяльнай жанчыны, Івана Міхайлавіча Сталярова – далікатнага настаўніка і выдатнага мастака-акварэліста і іншых педагогаў. Хочацца ўспомніць усіх добрым словам, сардэчна падзякаваць за іх працу і тыя веды, якія яны нам перадалі, за бацькоўскія адносіны да нас.

Напярэдадні юбілею роднай альма-матар зычу цяперашнім студэнтам і педагогам захоўваць і прадаўжаць існуючыя славутыя традыцыі. Дзякуючы актыўнаму кіраўніцтву ўніверсітэта, сёння ВДУ перажывае сапраўдны рэнесанс.

У добры шлях, паважаныя калегі і сябры!»

**Святлана Леанідаўна РУМЯНЦАВА, настаўніца ДУА «Сярэдняя школа №15 г. Наваполацка» кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст», выпускніца факультэта беларускай мовы і літаратуры 1993 года, «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь-2017»:**

«Сардэчна віншую ўвесь калектыў, ветэранаў, студэнтаў і выпускнікоў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта з цудоўным і знакавым юбілеем – 110-годдзем з дня заснавання!

Дарагая альма-матар, ты дала шлях у прафесійнае жыццё не толькі мне, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры, але і маёй матулі Лідзіі Маркаўне Раманенка, настаўніцы матэматыкі, маім сёстрам Алене і Таісіі, якія выкладаюць хімію і біялогію, геаграфію, маёй дачцэ Дзіяне, настаўніцы англійскай мовы.

Уся наша педагагічная дынастыя ўдзячная табе за глыбокія веды, за тое, што ты дала энергію і натхненне рухацца ўперад, браць новыя вяршыні ў працы і ў жыцці. І можа таму, што ўсе мы вучыліся ў тваіх сценах, настаўніцтва стала не проста прафесіяй, а справай жыцця, жыцця нашай сям'і.

Для мяне студэнцкія гады незабыўныя. Гэта і шчырае сяброўства, і бяссонныя ночы за кнігамі, і першыя крокі да прафесіі.

Запомніліся мне і заняткі з любімымі выкладчыкамі, і душэўныя вечары ў інтэрнаце, і праца на палях Талачынскага раёна, і атмасфера Віцебска – горада майго юнацтва. Гэта былі гады, напоўненыя святлом ведаў, сяброўства, кахання.

На апошнім пятым курсе мы, студэнты, не толькі вучыліся, але і працавалі. У той час у Віцебскай вобласці не хапала настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, таму выпускнікі 54-й і 55-й груп былі накіраваны па размеркаванні ў розныя мястэчкі і гарады Віцебшчыны.

Я ўдзячна выкладчыкам, якія зацікавілі сваім прадметам не адно пакаленне студэнтаў і запалілі агеньчык любові і аддансці беларускай мове і літаратуры ў маёй душы. Педагагічнае майстэрства, глыбокае веданне сваёй дысцыпліны, розум, маральная высакароднасць, душэўная прыгажосць, незаспакоенасць – усім гэтым надзелены мае педагогі.

За гады працы было рознае: радасць і расчараванне, знаходкі і страты, задавальненне ад здзейсненага і бясонныя ночы. Але заўсёды было адчуванне, што самая высакародная, універсальная, найлепшая прафесія была выбрана мной тады, калі я паступала ў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава.

Дарагія выкладчыкі, дзякуй вам за стваральную працу, неабыякавасць, аддансць справе, за глыбокае веданне свайго прадмета, за розум, маральную высакароднасць, душэўную прыгажосць!



У гэты святочны дзень жадаю роднаму ўніверсітэту далейшага развіцця і новых здзяйсненняў, усім супрацоўнікам ВНУ – поспехаў у працы, студэнтам – у засваенні ведаў! Здароўя, дабрабыту і шчасця вам, сябры!»